УДК 811.161.3’373

# ФУНКЦЫІ АКАЗІЯНАЛІЗМАЎ У ПАЭЗІІ А. РАЗАНАВА

**Самсонава Маргарыта Аляксандраўна**
аспірант кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя
А.А. Куляшова”
(г. Магілёў, Беларусь)
samsonova_margarita@rambler.ru

*У артыкуле прыводзяцца некаторыя класіфікацыі функцый аказіяналізмаў, разглядаюцца асноўныя функцыі аказіяналізмаў у паэзіі А. Разанава (намінатыўная, стылістычная, характаралагічная і функцыя эканоміі моўных сродкаў).*

А. Разанаў зарэкамендаваў сябе сапраўдным майстрам аказіянальнага слова. Творчасці паэта ўласцівы разнастайныя жанры, вобразна-стылявыя сродкі, яркая метафарычнасць, тонкі псіхалагізм, эксперыменты ў галіне стылю, мовы і слова.

Аказіяналізмы з’яўляюцца вынікам творчага працэсу. Яны надаюць тэксту выразнасць, яркую вобразнасць, прымушаюць пераасэнсаваць раней вядомае, ствараючы тым самым той непаўторны каларыт мовы, які адрознівае сапраўдных майстроў слова. Высокамастацкія, эстэтычна каштоўныя наватворы з’яўляюцца важным тэкстаўтваральным сродкам, адрозніваюцца выключнай семантычнай ёмістасцю. Пры гэтым яны не губляюць навізны і свежасці на працягу стагоддзяў.

Індывідуальныя неалагізмы заўсёды былі прадметам пільнай увагі навукоўцаў, з аднаго боку, як праява моўнай асобы аўтара, яго ідыястылю; з другога боку, як унікальнае спалучэнне, сінтэз нацыянальнай мовы, культуры і асабістага светаўспрымання аўтара.

Прычыны, якія накіроўваюць мастакоў слова да стварэння індывідуальна-аўтарскіх утварэнняў, наступныя: а) неабходнасць дакладна выказаць думку (узуальных слоў для гэтага можа быць недастаткова); б) імкненне аўтара коратка выказаць думку (наватвор можа замяніць словазлучэнне і нават сказ); в) патрэба падкрэсліць свае адносіны да прадмета гаворкі, даць яму сваю характарыстыку, ацэнку; г) імкненне своеасаблівым абліччам слова звярнуць увагу на яго семантыку; д) патрэба пазбегнуць таўталогіі; е) неабходнасць захаваць рытм верша, забяспечыць рыфму. Вельмі часта ўзнікненне наватвора бывае выклікана не адной, а адразу некалькімі прычынамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пад мастацкімі функцыямі разумеецца сукупнасць прыёмаў, выбраных аўтарам для рэалізацыі мастацкай задумы. Менавіта таму мастацкая функцыя рэалізуецца ў спосабах словаўтварэння і словаўжывання і паказвае імкненне аўтара дасягнуць найбольшай экспрэсіўнасці ў мастацкім тэксце.

У сучаснай лінгвістыцы існуюць розныя класіфікацыі функцый аказіяналізмаў. Напрыклад, Эр. Ханпіра апісвае тры функцыі: намінатыўна-мастацкую, экспрэсіўную і функцыю "комікі і гратэску" [5]. Р. Ю. Намітокава вылучае восем розных функцый аказіяналізмаў, групуючы іх па дзвюх падставах: у адносінах да плана ўспрымання аказіяналізма і ў адносінах да структуры мікракантэксту, дзе функцыянуе аказіяналізм [2].

З'яўленне аказіяналізмаў у паэтычным тэксце звычайна выклікана або неабходнасцю назваць новыя рэаліі або паняцці, для выражэння якіх у мове яшчэ няма сродкаў, або жаданнем вылучыць новым словам адценні сэнсу, якія патрэбны паэту, падкрэсліць сваё стаўленне да названага, даць яму індывідуальна-аўтарскую ацэнку. Асноўнымі функцыямі аказіяналізмаў з'яўляюцца намінатыўная, стылістычная, характаралагічная (ацэначная) і функцыя эканоміі моўных сродкаў.

Функцыі паэтычных наватвораў часта залежаць ад таго, ці мае названая з'ява сваё абазначэнне ў мове. Калі наватвор называе паняцце, якое не мае абазначэння ў мове, ён выконвае *намінатыўную функцыю*. Асаблівасцю паэтычных наватвораў з'яўляецца тое, што яны могуць быць як сродкам непасрэднай намінацыі (*нудзень, смакосы*), так і сродкам стварэння мастацкага вобраза, які перадае індывідуальна-аўтарскае светаадчуванне (*сан-час, санавіты*). Намінатыўныя аказіяналізмы ўзнікаюць у мастацкім тэксце ў якасці назваў новых паняццяў, якія адсутнічаюць у рэчаіснасці. Такія аказіяналізмы ніколі не выходзяць за межы аўтарскага тэксту: *... нам яшчэ трэба ўбачыць у іншых сябе, у сабе – нябёсы, у нябёсах – сонца, а ў сонцы –* ***сонцалюдзей*** [3, с. 292]; *Прытуліўшыся да сцяны вазоўні, сані спяць і вясною, і летам, і восенню і сняць тую пару, калі настане* ***"сан-час"****. Тады ім адчыняюцца дзверы ў шырокі свет, тады яны маюць пашану, тады аднаўляецца іхняе існаванне, тады яны вяртаюцца ў свой* ***"санавіты"*** *стан і пішуць на белай аснове свае няўрымслівыя высновы* [3, с. 426]; *Будзень – падзея, свята – з'ява, будзень – агледзіны, свята – сватанне, будзень распачынае, свята вянчае, будзень – жаніх, свята – нявеста, будзень –* ***"нудзень"****, свята – вяселле* [3, с. 417]; *Каса не спакушаецца славай і не выстаўляецца напаказ: яна толькі першаю, у расу, каштуе тыя* ***"смакосы"****, якія пасля будуць каштаваць каровы і козы* [3, с. 384] і інш. Вядома, што семантыка слова і дадатковыя сэнсавыя адценні ў паэзіі цалкам вызначаюцца кантэкстам. Асабліва адчувальны ўплыў кантэксту



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пры вызначэнні сэнсу аказіяналізмаў, якія зразумелы толькі ў пэўным кантэкстуальным асяроддзі і па-за ім звычайна не ўжываюцца. Большасць аказіяналізмаў мае або шматзначнае, або ўмоўнае, расплывістае значэнне, і толькі кантэкст можа яго вызначыць, канкрэтызаваць. Так, напрыклад, Н. І. Фельдман піша: "Цесная сувязь слоў-самаробкаў з кантэкстам, з якога яны як бы вырастаюць, робіць іх дарэчнымі і асабліва выразнымі на сваім месцы, аднак разам з тым, як правіла, перашкаджае ім адарвацца ад кантэксту і здабыць жыццё па-за ім" [4, с. 66].

Калі наватвор называе паняцце, якое мае сваё абазначэнне ў мове, ён можа несці *стылістычную функцыю*. У гэтым выпадку наватворам у мове адпавядае сінанімічнае слова або спалучэнне слоў, суаднясенне з якімі і раскрывае ў наватворы новыя стылістычныя або эмацыйна-сэнсавыя адценні. Такія аказіяналізмы маюць сінонімы, якія ўступаюць ім па інтэнсіўнасці экспрэсіўнай афарбоўкі: *Не сплю.* ***Адліжна.*** *Поле туманіцца ў акне* [3, с. 78]; *Паслаў у прастору думку, апаматаўшыся – другую... Што робіцца зараз там, у абсягах вашых,* ***думка-галубка*** *і* ***думка-крумкач****?!* [3, с. 89]; *... у галінах вагаецца крык,* ***успуджваючы*** *ўсё навокал* [3, с. 93]; *Ці чуеш, асушаная* ***балацінка****: кнігаўкі прыляцелі?!* [3, с. 103]; *Яны закрываюцца ад мяне: у іхняй закрытасці – іхняя моц, у іхняй закрытасці – іх* ***каменнасць*** [3, с. 248]; *Раскопваюць гарадзішча. Выкопваюць рэчы. Вось* ***рэч-рука****, вось* ***рэч-нага****, вось* ***рэч-моц****, вось* ***рэч-улада****. Рэчы – апошняе цела людзей, якое жыве найдаўжэй* [3, с. 254]; *Вы ўтрымліваеце ў сабе* ***звышвыйсце****: палёт стралы* [3, с. 294]; *Дуб і падобны да ўсіх іншых дрэў, і адрозніваецца ад іх менавіта сваёй большай* ***драўлянасцю****,* ***дрэвавасцю****...* [3, с. 370]; *...ён увасабляе сабою трыяду часу: даўніну,* ***цяпершчыну*** *і будучыню і сваім існаваннем сцвярджае: быў, ёсць, буду* [3, с. 370]; *Пры беразе* ***бярложыцца*** *Бярэсце...* [3, с. 389] і інш.

Нярэдка аказіяналізмы валодаюць здольнасцю характарызаваць сітуацыю, даваць ацэначнае меркаванне падзеям і асобам, гэта значыць аказіяналізмы выступаюць у *характаралагічнай (ацэначнай) функцыі*. Аўтары, выкарыстоўваючы наватворы для стварэння характарыстыкі, маюць на мэце не столькі назваць прадмет, колькі ахарактарызаваць яго і выказаць сваё стаўленне да яго (станоўчае ці адмоўнае): *Паўзе слімак па дарозе, якую сам пракладае:* ***слізіць****...* ***слімачыць****...* [3, с. 148]; *... Юліна – Юлі, табе – Карпячовае і* ***слімаковае*** *– слімаку...* [3, с. 149]; *Ва ўсіх свае* ***дзялкі****, свае заняткі, свая самастойнасць – яна адно* ***служкавала****: зрабі, Тэкля, паглядзі, Тэкля, падай, Тэкля... Рабіла, глядзела і падавала, і меркавання свайго не мела* [3, с. 161]; *Пчалу нельга забіваць: яна –* ***пЧАЛа****, у ёй захоўваецца чалавечы пачатак, і людзі шануюць яе, як чалавека* [3,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

с. 392]; *Баламуцячы сілу ліхую, сінявокі, як дзень,* ***валхвец*** *– у балоце глубокім валхвуе экскаватаршчык* ***Абравец****...* [3, с. 136]; *... захлынаецца ў твані карэц, экскаватар хрыпіць адчайна...* ***Абрываецца Абравец****, вырываецца...* [3, с. 137] і інш.

Аўтарскія наватворы нярэдка выкарыстоўваюцца ў якасці эканамічнага спосабу выказвання думкі для абазначэння паняццяў, якія ў мове маюць толькі апісальную форму выказвання, не маюць аднаслоўнай намінацыі (*функцыя эканоміі часу і моўных сродкаў*): *Зялёны мох на страсе –* ***песнаспеў*** *зялёны асенняму хмураму небу* [3, с. 95]; *Пярун* ***уладарна*** *загадвае...* [3, с. 197]; *яны ўжо бачаць таго, хто ім сустрэнецца* ***самапершы*** *і каго яны ўзнгародзяць сваім вянком* [3, с. 356]; *Холад – дрыготка, голад – сутарга, холад –* ***душахват****, голад – жываглот...* [3, с. 413]; ***Безмаёмасны****, бы манах-дамініканец, і багаты, бы цар Мідас, дым падымаецца ўгору ...* [3, с. 371]; *брук барукаецца з бязладдзем, але бурчыць і на* ***гладкапіс*** [3, с. 377]; *калода* ***“раскалоджваецца”****, пераўладкоўваецца ў нешта адрознае ад сябе...* [3, с. 381]; *Каб аперазаць паўнеба, маланцы дастаткова вокамгнення,* ***вокаміргнення****...* [3, с. 386] і інш.

Экспрэсіўнасць з’яўляецца адной з асноўных уласцівасцяў аказіяналізмаў, тут часта дзейнічае тэндэнцыя: “чым больш парушаны законы мовы пры стварэнні аказіянальнага слова, тым вышэй яго выразнасць” [1, с. 165]. Напрыклад, у слове *глыбіня* адбылася перастаноўка гукаў, якія супалі з асновай прыметніка *гіблы*. У аказіяналізме *гіблыня* сумясціліся значэнні дзвюх утваральных асноў – *гіблая глыбіня*: *Багна абагульняе ваду і сушу, і хто ўгадае, якая яе* <u>*глыбіня*</u>*, якая ў яе* ***“гіблыня”*** [3, с. 446]; *Усё, што здараецца з* <u>*дарогай*</u>*, здараецца і з чалавекам, і ўсё, што ні здараецца з чалавекам, здараецца якраз у дарозе, бо сама прырода дарогі –* <u>*здарацца*</u>*,* ***“здарагацца”*** [3, с. 373] і інш. Экспрэсіўнасць – гэта тое, што адрознівае наватворы ад узуальных слоў. Аказіяналізмы экспрэсіўныя самі па сабе, у сувязі са сваім будынкам. З дапамогай экспрэсіі аказіяналізмы ўзмацняюць ўражанне. Але ступень экспрэсіўнасці ў кожнага аказіяналізма свая, гэта залежыць ад таго, наколькі парушаны правілы словаўтварэння.

У паэтычным свеце А. Разанава арганічна спалучаецца традыцыя з наватарствам. З’яўленне аказіяналізмаў у творчасці паэта разлічана на пэўны экспрэсіўна-стылістычны эфект. Эфект гэты ўзнікае таму, што чытач сам асэнсоўвае працэс нараджэння індывідуальна-аўтарскіх наватвораў. У агульным кантэксце наватворы выконваюць пэўную стылістычную задачу, іх з’яўленне ў творчасці А. Разанава не выпадковае. Гэта не проста моўны эксперымент, а пошук самавыражэння, імкненне папоўніць лексічную скарбонку беларускай мовы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Спіс літаратуры

1. Бутакова, Л. О. Морфемика и словообразование : учеб. пособие / Л. О. Бутакова. – М. : Флинт : Наука, 2012. – 232 с.

2. Намитокова, Р. Ю. Авторские неологизмы: словообразовательный аспект / Р. Ю. Намитокова ; отв. ред. И. А. Ширшов ; Адыг. гос. пед. ин-т. – Ростов н/Д : Изд-во Рост. ун-та, 1986. – 156 с.

3. Разанаў, А. Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў // Мінск : Маст. літ., 1999. – 462 с.

4. Фельдман, Н. И. Окказиональные слова и лексикография / Н. И. Фельдман // Вопросы языкознания – 1957. – № 4. – С. 64 – 73.

5. Ханпира, Э. Окказиональные элементы в современной речи / Э. Ханпира // Стилистические исследования: на материале современного русского языка : сб. ст. / под ред. В. Д. Левина. – М. : Наука, 1972. – С. 245–317.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова